**БАЯВЫ ЗАГАД № 033**

Штарм 13 4.8.41 г. 3.00

Боевой приказ № 032 отменяется, вместо него ввести настоящий приказ.

1. Прорвавшаяся танковая дивизия заняла Рославль. Противник подтягивает на восток 7 и 13 пд.

2. Группа Качалова наносит удар по прорвавшемуся противнику сев. и сев. восток.

3. 13 А, сковывая противника в районе Рославль и в районе Кричев, наносит удар с запада на ю. зап. Рославль группировке противника и во взаимодействии с группой Качалова уничтожает этого противника. Начало наступления 15-00 4.08, а для 52-й и 21-й кд. с получением приказа.

4. 222 с.д. с 2 бронепоездами не допустить противника вост. р. Остер на Брянск.

5. 52 кав. дивизии скрыто выдвинуться в район Студенец, Петровичи, перехватить дороги от Мстиславля на Рославль и прикрывать действие ударной группы слева.

6. 21 кав. дивизии выдвинуться в район в лес сев. Шумячи и выступать в направлении Гневково, Лесниковский, Шумячи.

7. 45 с. к. (121 и 137 с. д.) ближайшая задача выйти на рубеж Пожарь, Осва, Дубовица; удар наносить в тыл противника на Рославль.

8. 4 ВДК (6 сд., 7 и 8ВДБр и 44 БПО) прочно удерживать Кричевский плацдарм, наступлением на правом фланге овладеть переправой у Старый Дедин и овладеть рубежом р. Остер на фронте Старый Дедин, Ходунь, Зимонино.

9. ВВС Армии прикрывать действия ударной группировки 45 с. к. и 21 кав. дивизии.

Команд. 13 Армии Голубев
Член военного Совета Фурт
Нач. штаба Петрушевский

Без подписей. Допечатка для 222 с. д.

*Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 361. Воп. 6079. А. 3. Л. 16—17.*

## Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго палажэнні былі выкладзены Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25 мая 1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншароднага насельніцтва» ў напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму былі даволі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых сумнавядомых дакументаў, у тым ліку ў плане «Барбароса» (канчатковы варыянт выкладзены ў дырэктыве вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброенымі сіламі ад 18.12.1940), які вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР, генеральным плане «Ост» – праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі, «Інструкцыі пра асобныя вобласці» да дырэктывы № 21 плана «Барбароса» (13.3.1941 г.), дырэктыве па кіраўніцтву эканомікай у акупаваных усходніх

абласцях і інш. Гэтыя дакументы намецілі практычныя мерапрыемствы па ўстанаўленні акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі, якая падлягала захопу. У далейшым яны дапаўняліся загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванні, гвалтаванне і забойствы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны. Гэтыя дакументы цалкам развязалі рукі гітлераўскім катам і забойцам, вызваляючы іх ад усялякай адказнасці за здзейсненыя злачынствы.

Яшчэ задоўга да агрэсіі верхаводы трэцяга рэйха адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам план падзелу захопленай тэрыторыі.

Германская акупацыйная палітыка ўяўляла сабой шырокі комплекс мер, неад'емнымі састаўнымі часткамі і напрамкамі якіх разам з жорсткім тэрорам і вынішчэннем насельніцтва былі ліквідацыя ідэалагічна-палітычных асноў савецкай дзяржавы, разбурэнне прадукцыйных сіл, паўсюднае ўвядзенне рабска-прыгонніцкай арганізацыі працы, у тым ліку падлеткаў і дзяцей.

З першых дзён акупацыі жыхары раёна адчулі на сабе так званы «новы парадак». Нацысцкае ваеннае камандаванне не толькі лічыла апраўданымі масавы тэрор, рабаўніцтва, гвалт, забойствы, але і заклікала салдат і афіцэраў праяўляць жорсткасць да мясцовага насельніцтва. Згодна з дырэктывай ад 13 мая 1941 г. за подпісам фельдмаршала Кейтэля «Аб ваеннай падсуднасці ў раёне «Барбароса» і асобных паўнамоцтвах войск» узброеныя сілы Германіі «вызваляліся» ад усякай адказнасці за любыя злачынствы на акупаванай зямлі, афіцэрам вермахта давалася права расстрэльваць па сваім вырашэнні, без суда і следства ўсіх, хто трапляў пад «падазрэнне».

У загадзе, падпісаным Кейтэлем 17 верасня 1941 г., указвалася на неабходнасць «найбольш жорсткіх мер» як у барацьбе з партызанамі, так і ў адносінах да насельніцтва.

Шматлікія карныя арганізацыі і спецыяльныя часці – служба бяспекі (СД), зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), фельдкамендатуры, орткамендатуры, сельгаскамендатуры, паліцыя, жандармерыя, ахоўныя паліцэйскія часці, войскі СС – усё было кінута супраць савецкіх людзей.

Выканаўчымі органамі ў руках ваеннага камандавання ахоўных войск і камандуючага тылам групы армій «Цэнтр» былі камендатуры – палявыя (фельдкамендатуры) і мясцовыя (орткамендатуры), надзеленыя ўсёй паўнатой улады.

У тыле армій «Цэнтр» канцэнтраваліся вялікія сілы карнікаў. Органы паліцыі бяспекі і СД прадстаўлялі тут спецыяльныя аператыўныя атрады ваеннага тылу, вядомыя пад назвай айнзацгрупы (аператыўныя групы).

Асобую ролю ў сістэме ваенна-фашысцкага акупацыйнага апарату на тэрыторыі «вобласці армейскага тылу» выконвала тайная паліцыя (ГФП). У ГФП набіраліся супрацоўнікі гестапа, нямецкай паліцыі і іншых карных органаў. Каманды ГФП пры мясцовых камендатурах і ахоў-

33. Зак. 808

ных дывізіях дзейнічалі ў кантакце з паліцыяй бяспекі і СД, палявой жандармерыяй і іншымі карнымі органамі.

Для падтрымання «новага парадку», масавага крывавага тэрору ў раёне была створана сістэма нямецкіх гарнізонаў, а таксама апорных пунктаў дапаможнай паліцыі службы парадку, у якую ўваходзілі мясцовыя жыхары, што перайшлі на службу да акупантаў.

Адразу пасля захопу горада ў Крычаў прыбыў прызначаны фашысцкімі ўладамі нямецкі камендант са штатам чыноўнікаў. У гэты час быў прызначаны бургамістрам раёна П.З. Кісялёў, бургамістрам горада – С.Р. Крываносаў. Я.Д. Матвеенка стаў начальнікам паліцыі. Трэба адзначыць, што гэтыя здраднікі з вялікай радасцю пайшлі на службу да нямецкіх акупантаў. Сельскія Саветы былі ператвораны ў воласці. У іх былі падабраны бургамістры, а ў вёсках – старасты. Разам з нязванымі гаспадарамі вярнуліся ў горад і вёскі розныя крымінальнікі, якія адбывалі тэрміны ў лагерах і турмах за зробленыя злачынствы. Уводзілася амаль прыгонная праца, жорсткія падаткі, пачаліся расправы, рабаванне, гвалт. Планавалася вывезці на працу ў Германію вялікую групу «дабраахвотнікаў». За гады вайны ў фашысцкае рабства было адпраўлена каля 500 чалавек. Фашысты наладзілі сапраўднае паляванне на юнакоў і дзяўчат, пад аховай дастаўлялі на чыгуначную станцыю, заганялі ў таварныя вагоны і адпраўлялі ў Германію. Паўсядзённай практыкай фашысцкіх захопнікаў было знішчэнне населеных пунктаў разам з жыхарамі. І тая работа вялася мэтанакіравана, па пэўнай медодыцы, з самага пачатку вайны. У сасновым лесе, каля вёскі Прудок, на працягу двух гадоў гітлераўцы расстрэльвалі савецкіх людзей. У верасні 1941 г. фашысты спалілі вёску Антонаўка, знішчылі больш за 90 жыхароў. Нямногім вяскоўцам удалося тады ўратавацца. Сярод іх была Раіса Рыгораўна Кукуй.

У акце аб здзейсненых злачынствах нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў раёне адзначана, што ў 1944 г. пры аглядзе месц расстрэлаў савецкіх людзей было знойдзена 50 магіл, кожная з якіх мела памер 2 на 3 метры. Пры раскопцы магіл было ўстаноўлена, што яны запоўнены трупамі расстраляных савецкіх людзей, ад 5 да 25 чалавек у кожнай магіле, і што тут пахавана больш за



Помнік на брацкай магіле савецкіх ваеннапалонных у г. Крычаў.



Помнік ахвярам фашызму ў в. Прудок.

тысячу чалавек, у тым ліку 30 жанчын і 15 дзяцей розных узростаў.

Зараз на месцы расстрэлаў, у лесе каля вёскі Прудок, устаноўлены помнік ахвярам фашызму.

Па ініцыятыве нямецкага камандавання і іх памагатых здраднікаў Радзімы, наладжваліся шматлікія аблавы на байцоў і афіцэраў Чырвонай арміі, якія траплялі ў акружэнне і жылі ў той час у вёсках. Палонных адпраўлялі ў крычаўскі лагер або фізічна знішчалі. У вёсцы Мірнае (былая в. Глупікі) былі расстраляны 2, у вёсцы Прусіна – 10 воінаў Савецкай арміі. У верасні 1941 г. немцы прывялі ў в.Маляцічы 8 палонных чырвонаармейцаў, дзе і расстралялі.

Асабліва жорстка распраўляліся нямецкія акупанты з партызанамі, трапіўшымі ў палон. У снежні 1942 г. на плошчы ў Крычаве пасля жудасных катаванняў і здзекаў былі павешаны 5 партызан. Ворагі забаранілі іх хаваць.

Некаторыя бургамістры, старасты верай і праўдай служылі нямецка-фашысцкім акупантам. Даверам карыстаўся ў нямецкіх улад начальнік баеўскай паліцыі Я.С.Язерскі, якога жыхары помняць як жорсткага карніка. Старанна нёс службу ў нямецкіх акупантаў начальнік карнага атрада М.Г. Носенка. Гэты фашысцкі паслугач учыняў дзікія расправы над сем'ямі камуністаў, партызан і ўсімі вясковымі жы-



Р.Р. Кукуй.

харамі, якіх падазравалі ў сувязі з лясными мсціўцамі.Фёдар Рулеў з атрада баеўскай паліцыі за забойства чатырох савецкіх воінаў, якія трапілі ў нямецкі палон, быў узнагароджаны гітлераўцамі жалезным крыжам.

Фашысцкі паслугач Антон Кучук з маляціцкай паліцыі ў лістападзе 1941 г. расстраляў 19 мірных савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці.

Звярыным здзекам і знішчэнню падвяргаліся мірныя савецкія людзі, асабліва яўрэйскае насельніцтва горада і раёна. Увосень 1941 г. па загаду камендантa Крычава гестапаўца Бергера былі сабраны яўрэйскія сем'і ў колькасці 80 чалавек. У большасці гэта былі старыя, жанчыны, малыя дзеці. Ім стварылі невыносныя ўмовы для жыцця: вельмі дрэнна карміілі, а на работу ганялі штодзённа. Хто ад знясілення не мог працаваць, таго білі палкамі. Так працягвалася два месяцы. Затым іх, зусім знясіленых, прывялі на тэрыторыю цэментнага завода, прымусілі выкапаць яму і ўсіх расстралялі. Жудасны лёс напаткаў яўрэйскія сем'і ў вёсках Маляцічы і Антонаўка. У лістападзе 1941 г. у Маляцічах фашысты расстралялі 70 яўрэяў. На другі дзень каля моста расстралялі яшчэ 19 чалавек. 14 лістапада 1941 г. у вёсцы Антонаўка было расстраляна 18, а праз 3 дні – 12 чалавек. Завялі іх у балота, прымусілі разуцца і распрануцца да нацельнай бялізны, а затым расстралялі. Трупы расстраляных не дазвалялі хаваць на працягу пяці дзён.

За перыяд свайго гаспадарання ў горадзе і раёне фашысцкія захопнікі закатавалі і расстралялі шмат ваеннапалонных і мірных савецкіх грамадзян.

*В.Ф. Куліненка.*

## Дакументы сведчаць

### З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

Пераклад з нямецкай мовы 7.7.1941.

**І.Аб прызначэнні бургамістраў у валасцях.**

1. На пасады бургамістраў у першую чаргу павінны быць прызначаны палітычна надзейныя і кваліфікаваныя асобы, па магчымасці з ліку беларусаў.
2. Бургамістр з'яўляецца прадстаўніком воласці.
3. Ён з'яўляецца службовым начальнікам над усімі асобамі, якія працуюць у воласці. Ён прымае іх і звальняе з працы.
4. Бургамістр нясе адказнасць за фінансавыя справы воласці.
5. Усе жыхары, якія пражываюць у воласці, паводле становішча на 21.6.1941 г., павінны быць нанова ўлічаны і перапісаны бургамістрам.